Гамельчук спытаў у суддзі чаму Лукашэнку не караюць за ўдзел у несанкцыянаваным пікеце

08.04.2021



Міхаіл Русак ля суду

Суддзя суду гомельскага раёну **Сусла** пакараў штрафам 63-гадовага **Міхаіла Русака** за несанкцыянаваны пікет, якім ён палічыў аркуш белай паперы 10см. - 20см. з чырвонай паласой па цэнтры ў вакне яго прыватнага дому ў Чонках.



Падчас суду сп.**Русак** патлумачыў, што ён верыць у Хрыста, а ў вакне вісеў не бчб-сцяг, а сімвал хрысціянскай веры.

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2021

СВАБОДА СХОДАЎ

Тры гады "хатняй хіміі" — за знаходжанне на праспекце і парушэнне працы "Мінсктранса"

Дзяржабвінавачанне запрасіла два гады калоніі для палітвязня Івана Багдзевіча

Што адбывалася ў судах па адміністрацыйных справах цягам тыдня?

Ці можна трапіць у калонію, калі своечасова не зняў бчб-сняжынкі з акна? Юрыст расказвае пра змены ў Крымінальным кодэксе

СМЯРОТНАЕ ПАКАРАННЕ

Сястра асуджанага да смяротнага пакарання Віктара Паўлава: "Яго хутчэй за ўсё расстралялі"

Андрэй Палуда: "Пакуль няма сістэмных зменаў, новыя прысуды і расстрэлы могуць адбыцца ў любы момант"

Вярхоўны суд не задаволіў апеляцыйную скаргу асуджанага да смяротнага пакарання Віктара Скрундзіка

Асуджаных да смерці братоў Косцевых памілавалі

“Гэта сімвал Хрыста – яго кроў і праведнае, светлае аддзенне, - тлумачыў у судзе ***Міхаіл Русак****. – Я павесіў гэты знак, каб усе ведалі, што ў хаце жыве хрысціянін, да якога можна прыйсці па дапамогу. Да мяне прыходзяць галодныя людзі, якія ў лесе жывуць, я іх кармлю, даю ім вопратку, грошы. Я служу народу такім чынам ўжо каля 30 гадоў”.*



Падчас суду

Сп. Міхаіл паведаміў у судзе, што ён не пікетаваў, а само слова “пікет” даведаўся, калі рыхтаваўся да суду. У вызначэнні, якое ён прачытаў у Вікіпедыі, пазначана, што пікет – гэта форма публічнага выказвання думак, меркаванняў, пратэсту. Нічога падобнага ён не рабіў.

Пенсіянер-вернік падчас працэсу наракаў на супрацоўніка АУСу гомельскага раёну **Касакевіча,** які на яго думку, дапусціў парушэнні падчас складання пратаколу аб адміністратыўным правапарушэнні: яму не зачыталі яго правы, не даслалі копіі пратакола па пошце.

Гамяльчук прадэманстраваў у судзе фатаздымкі з хрысціянскага пахавання з удзелам **Лукашэнкі** і беларускага метрапаліту, дзе на труне ляжыць бчб-стужка і заўважыў, што кіраўніка Беларусі не прыцягваюць да адказнасці за несанкцыянаваны пікет.



“Чаму Лукашэнку не прыцягваюць да адказнасці за несанкцыянаваным пікет разам з царкоўнікам, які апрануты ў царкоўнае аддзене з бчб колерамі?, - паставіў перад суддзёй рытарычнае пытанне сп. Міхаіл”.

Падчас працэсу **Міхаіл Русак** віны не прызнаў, але апеляцыю падаваць не збіраецца, бо не бачыць у ёй сэнсу.

“Гэты суд раённы падпарадкоўваецца аднаму чалавеку, - каментуе Міхаіл рашэнне суду, - які з дапамогай ваенных захапіў уладў. Ён можа ладзіць пікеты несанкцыянаваныя. Наконт штрафу, я не хачу, каб нават мая капейка ішла на такія суды і на такое кіраўніцтва, - кажа Міхаіл Русак. – Хай вылічваюць з пенсіі”.



Сп. **Русак** быў вымушаны зняць аркуш паперы з крыжом, за які яго прыцягнулі да адказнасці і павесіў новы, дзе на белай паперы чырвонымі літарамі напісаў "Ісус Хрыстос".

Аўтар **Ларыса Шчыракова**

Фота аўтара

Гомельская вясна

ВІДЭА



БЛОГІ



ЛЕАНІД СУДАЛЕНКА

ЯК Я НЕ СТАЎ УДЗЕЛЬНІКАМ НАРОДНАГА "ХУРАЛА" ЦІ ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!



ЛАРЫСА ШЧЫРАКОВА

Як прайшла спецаперацыя ГУБАЗіК па пошуку брудных майткоў у журналісткі ці кароткая гісторыя аднага ператрусу

НАВІНЫ ПАРТНЁРАЎ

20.04.2023 Андрэй Горват з'ехаў з Беларусі. Што будзе з палацам у Нароўлі? «Новы час»

07.04.2023 Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе «Вясна»

23.03.2023 Зняў двух п'яных расейскіх вайскоўцаў – трапіў пад пераслед, але здолеў збегчы радыё «Свабода»

07.03.2023 Ксенія Луцкіна перахварэла ў калоніі на двухбаковую пнеўманію «Народная воля»

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА Ў СВЕЦЕ

08.08.2022 Пошта ЗША спыніла адпраўленні ў Беларусь

26.07.2022 «Інфармацыя пра маё затрыманне нават мяне шакавала»: ураджэнца Гомельшчыны ўжо тры месяцы трымаюць у ІЧУ ў Расеі

23.07.2022 У Польшчы знік 18-гадовы хлопец з Калінкавічаў

14.07.2022 У Кіеве заявілі аб імавернасці ўзброеных правакацый у памежных з Украінай раёнах Гомельшчыны і Берасцейшчыны

САЦЫЯЛЬНЫЯ СЕТКІ









ПАРТНЁРЫ

Праваабарончыя сайты: Брэст Віцебск Гародня Магілёў

© 2023 Гомельская вясна

stryzhakandrej@gmail.com | sutiajnik@gmail.com